З каталіцкага друку (141)

Аўтар: Кінга Красіцкая
21.05.2017 00:00

Манету ў гонар
свсв. Пятра і Паўла
адчаканяць у Ватыкане

Яна будзе выпушчана Ватыканскім філатэлістычна-нумізматычным аддзелам да 1950-й гадавіны мучаніцкай смерці святых Апосталаў. Графічнае афармленне манеты распрацавала італьянскі скульптар Габрыэла Цітола. На ёй прадстаўлены святыя і характэрныя для іх іканаграфічныя сімвалы – ключы і меч. Першы спасылаецца на перадачу св. Пятру Езусам ключоў ад Нябеснага Валадарства, а другі – на жыццё і мучаніцкую смерць св. Паўла.

Набыць памятную манету можна будзе па кошце 18 еўра. †

Іспанскія мучанікі –
бласлаўлёныя

У каталонскай Жыроне адбылася беатыфікацыя кс. Антоніа Арыбаса Орцігуэла і 6-ці яго таварышаў. Усе належалі да Кангрэгацыі Найсвяцейшага Сэрца Пана Езуса. Загінулі падчас рэлігійнага праследавання ў перыяд грамадзянскай вайны ў Іспаніі. Пачатак вайны ў 1936 годзе застаў маладых людзей у ніжэйшай семінарыі іх кангрэгацыі, што знаходзілася паблізу Барселоны. Выгнаныя з альмаматэр, кс. Антоніа разам з таварышамі пастанавілі перабрацца ў Францыю, але сталі ахвярай здрады і былі выдадзены рэспубліканцам. На наступны дзень іх расстралялі. Малодшы меў толькі 20 гадоў, старэйшы – 28.

У гісторыю трагічна загінулыя ўвайшлі як “мучанікі з Канэт-дэ-Мар” (населены пункт у правінцыі Барселоны, дзе былі расстраляны бласлаўлёныя).

У Будслаў – на верталёце

Аўтар: Кінга Красіцкая
21.05.2017 00:00

Жадаючыя наведаць нацыянальны санктуарый і памаліцца каля абраза Маці Божай змогуць паляцець туды на верталёце. Рэалізоўвае праект мінскі аэраклуб ДТСААФ. Замовіць верталёт неабходна не пазней, чым за 3 гадзіны да планаванага часу вылету. Ініцыятарам новага фармату пілігрымак стала парафія свсв. Сымона і Алены ў Мінску.

У супрацоўніцтве з Рэспубліканскім саюзам турыстычных арганізацый плануецца павялічыць зацікаўленасць да Будслава з боку турыстаў, у першую чаргу замежных.